ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
9
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 24(1510)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

ВІНШУЕМ!

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШЫХ І СЯРЭДНІХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ УСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў XI пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі ўзнагародзіць:

ОРДЭНАМ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ:

КІСЯЛЕЎСКАГА Леаніда Іванавіча — рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР.

ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

ЦІХІНЮ Валерыя Гур'евіча, дэкана Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, дацэнта.

ШУБУ Паўла Паўлавіча, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

ОРДЭНАМ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ:

СЦЕПІНА Вячаслава Сямёнавіча, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»:

ШПІЛЕЎСКАГА Эдуарда Міхайлавіча, дэкана Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, дацэнта.

ЮРЧУКА Мікалая Іосіфавіча, сакратара парткома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»:

КАСПЯРОВІЧ Алу Станіславаўну, дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

КОРЗЮКА Віктара Іванавіча, дэкана Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, дацэнта.

МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»:

ВАРАПАЯ Яўгена Сямёнавіча, загадчыка лабараторыі Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі пры БДУ, дацэнта.

МУЛЯРЧЫКА Сцяпана Рыгоравіча, загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, дацэнта.

ПЕТУШКОВУ Яўгенію Васільеўну, дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

ХАНКЕВІЧ Вольгу Іванаўну, дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

ШЫБУТА Аляксандра Сцяпанавіча, асістэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
А. ГРАМЫКА.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Г. МЕНТЭШАШВІЛІ.

Масква, Крэмль.
20 жніўня 1986 г.

ФОТАРЭПАРТАЖ

*ТЫ ПРАЧЫНАЕШСЯ раніцай, глядзіш праз інтэрнацкае вакно на Свіслач і... зноў перажываеш найвялікшую радасць — ты студэнт! Ты выходзіш з пакоя, збягаеш па лесвіцы. Адна прыступка, другая... Усё добра знаёма, бо гэта цяпер твой дом. Ты адчыняеш дзверы аўдыторый, прывычна дастаеш канспект, слухаеш выкладчыка — гэта цяпер тваё жыццё.*

*А на здымку — пазнаў?! — твой самы святочны, самы першы студэнцкі дзень. Зірні, першакурснік, такім ты быў у Дзень ведаў.*

*(Фотарэпартаж аб святкаванні Дня ведаў чытайце на 2-й старонцы).*




ДА ВЫНІКАЎ УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ

# Хто ён, першакурснік?

**Адшумела пара ўступных экзаменаў, пара хваляванняў, трывог, радасцей і неапраўданых надзей. Для тых, хто паспяхова здаў экзамены і паступіў у БДУ імя У. І. Леніна, наступіў якасна новы перыяд у жыцці. Каб яго паспяхова прайсці, давядзецца вельмі многа працаваць. Хацелася б пажадаць першакурснікам смеласці, рашучасці і настойлівасці ў дасягненні пастаўленай мэты!**

ПРЫЙШОЎ час падвядзення вынікаў прыёму на першы курс па новых правілах. Адметнай рысай уступных экзаменаў гэтага года ў БДУ з'яўляецца вялікі конкурс амаль на ўсе спецыяльнасці. Аб гэтым гаворыць і прахадны бал. Напрыклад, прахадны бал на гістарычны факультэт — 16; на юрыдычны, біялагічны, філалагічны факультэты — 15; на факультэт радыёфізікі і электронікі, факультэт журналістыкі, геаграфічны, ФПМ, фізічны (вытворчы паток) — 14; на механіка-матэматычны і хімічны факультэты былі залічаны толькі медалісты і асобы, якія прайшлі па эксперыменту; 12 балаў — на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры. Асабліва вялікі конкурс быў на гістарычны, юрыдычны і матэматычныя факультэты, на якія практычна атрымаўся конкурс сярод медалістаў і асоб, якія маюць дыпломы з адзнакай.

Напрыклад, на 75 месцаў на гістфак было пададзена 442 заявы, з якіх 96 заяў медалістаў; на 175 месцаў на юрыдычны факультэт было пададзена 739 заяў, з якіх 209 заяў медалістаў; на 125 месцаў на мехмат было пададзена 290 заяў, з якіх 116 чалавек мелі медалі або дыпломы з адзнакай аб заканчэнні сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў і прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. Агульная карціна ў гэтым годзе была такой: на 1800 планавых месцаў паступала 1250 чалавек, якія маюць медалі ці дыпломы з адзнакай.

На наш погляд, пісьмовы экзамен па рускай мове і літаратуры прадугледжвае не толькі праверку пісьменнасці абітурыентаў, без якой немагчымы будучы студэнт, але і іх веданне літаратуры, а таксама найбольш значных гістарычных і сацыяльных з'яў і падзей, адлюстраваных у ёй. Уяўляецца мэтазгодным, па меншай меры ў выглядзе эксперыменту, увесці ў будучым годзе сачыненне ў якасці прафілюючага прадмета на ўступных экзаменах для абітурыентаў гуманітарных факультэтаў. А для юрыдычнага факультэта ў якасці прафілюючай дысцыпліны варта ўвесці вусную матэматыку, як у МДУ імя М. В. Ламаносава. Магчыма, няма неабходнасці ў БДУ даваць на сачыненні так званыя вольныя тэмы грамадска-палітычнага плану. Для гэтага ёсць экзамен па грамадазнаўству.

Якія ж веды паказалі абітурыенты на экзаменах? Паступаючы на прыродазнаўчыя факультэты, усе абітурыенты здавалі экзамен па матэматыцы і ў цэлым паказалі дастаткова добры ўзровень ведаў. Большасці абітурыентаў прывіты навыкі дакладна і сцісла выказваць матэматычную думку ў вусным і пісьмовым выкладзе. Яны ўпэўнена валодаюць матэматычнымі ведамі, прадугледжанымі праграмай, і многія з іх умеюць рашаць нестандартныя задачы. Для ацэнкі ведаў па матэматыцы абітурыентаў хімічнага і геаграфічнага факультэтаў выкарыстоўвалася ЭВМ. Назапашаны ў БДУ вопыт машыннага прыёму ўказвае на яго перавагі перад прыёмам традыцыйным. ЭВМ дазволіла прапанаваць абітурыентам 20 задач па ўсіх раздзелах праграмы ўступных экзаменаў. Такая вялікая колькасць задач дала магчымасць праверыць веды ў больш поўным аб'ёме школьнай праграмы. Асабліва добра справіліся з прапанаваным заданнем абітурыенты хімічнага факультэта. З 258 чалавек, здаўшых экзамен ЭВМ, 146 абітурыентаў атрымалі «добра» і «выдатна».

Хацелася б сказаць некалькі слоў аб прафарыентацыйнай гутарцы, якая праводзілася перад экзаменамі. Трэба адзначыць, што такая гутарка не з'яўляецца чымсьці новым. У форме творчага конкурсу яна даўно праводзіцца на факультэце журналістыкі. Выпрацоўка ж палажэння аб прафарыентацыйнай гутарцы для ўсіх факультэтаў аказалася справай новай. Прыёмная камісія універсітэта адной з першых распрацавала такое палажэнне. Хаця яно і рэгламентавала правы факультэцкіх прафарыентацыйных камісій, але, на думку дэканаў факультэтаў, сябе апраўдала. Да ўдзелу ў гутарцы былі прыцягнуты найбольш аўтарытэтныя вучоныя і педагогі, прадстаўнікі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый універсітэта. На гутарцы дазвалялася прысутнічаць бацькам, настаўнікам. Гутарку ва універсітэце прайшлі 4237 чалавек. Тры ільготныя балы на ей атрымалі 98 абітурыентаў. Два — 2140, адзін — 1151. У той жа час трэба адзначыць, што камісія не дала 13 абітурыентам рэкамендацыю на выбраную спецыяльнасць.

Як паказала практыка, палажэнне аб прафарыентацыйнай гутарцы павінна быць больш дыялектычным, даваць больш магчымасцей прафарыентацыйным камісіям. Напрыклад, па універсітэцкаму палажэнню за залатыя ці сярэбраныя медалі давалася два балы. Думаю, што камісія павінна мець права паставіць адзін бал медалісту, калі ён на гутарцы сябе не праявіў, ці паставіць тры балы, калі абітурыент па сваіх дзелавых якасцях таго заслугоўвае. Ёсць шэраг і іншых момантаў. Напэўна, на наступны год палажэнне трэба дапрацаваць і праводзіць гутарку не перад экзаменамі, а пасля іх.

Сёння трэба падвесці вынікі работы і самой прыёмнай камісіі. Прафарыентацыйныя і прадметныя камісіі працавалі зладжана, у абставінах павагі і даверу да абітурыентаў. Сведчанне таму — адсутнасць скаргаў і нязначная колькасць апеляцый, некаторыя з якіх былі задаволены.

П. САЛАЎ,
дацэнт кафедры электронных матэматычных машын, намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі.

ФОТАРЭПАРТАЖ

# Дзень ведаў — кожны дзень!

**ЯК ВЯДОМА, адной з найбольш адметных рыс рэпартажу з'яўляецца аператыўнасць. Наш фотарэпартаж такой якасці па ўважлівай прычыне (галоўны чытач — студэнт — адбыў на дапамогу калгасам і саўгасам) не мае. Але падзея, якая адбылася 31 жніўня ва ўніверсітэцкім жыцці, мае значэнне не толькі для галоўных удзельнікаў урачыстасці, але і для ўсёй шматлікай універсітэцкай сям'і.**




Хто ж яны, галоўныя ўдзельнікі той урачыстасці? Сімпатычныя, спартыўныя, трохі мітуслівыя, усхваляваныя юнакі і дзяўчаты — пазаўчарашнія выпускнікі школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, учарашнія абітурыенты, сённяшнія першакурснікі. Цікава, што нягледзячы на свой не такі ўжо і сталы ўзрост, побач з імі адчуваеш, што іх гады — ўжо не твае і таму кропельку нават зайздросціш. З настальгіяй успамінаеш рыпуча-грымучыя дзверы роднай школы, твары настаўнікаў, такія добразычлівыя ў апошнія развітальныя дні да ўсіх нас без выключэння, рознакаляровыя астры на школьных клумбах, якія 1 верасня новага навучальнага года будуць вітаць ужо не нас...

А памятаеце, як на выпускным вечары дырэктар, завучы, настаўнікі, бацькі гаварылі пра новае, самастойнае жыццё, ад усяго сэрца жадалі і жадалі толькі добрых і светлых дарог?!

Дарога з указальнікам «Універсітэт» не толькі шырокая, светлая, прэстыжная, але не менш цяжкая, з асаблівымі перашкодамі для кожнага, хто калісьці задумаў па ёй крочыць



доўгіх 5 гадоў. Задумваюць такі сур'ёзны паход як правіла людзі адважныя, здольныя, упэўненыя ў сваіх сілах. І вось сёння для многіх з іх першае галоўнае выпрабаванне — уступныя экзамены — ужо ў мінулым, і з ганарлівасцю, перамоганосна трымаюць яны транспарант «Рубікон перайшлі —мы паступілі!».

Ад усей душы віншуем!

ДА СВЯТА ВЕДАЎ рэктарат, партком, камсамольская арганізацыя універсітэта рыхтаваліся даўно, па-дзелавому і з пачуццём гаспадара, які жадае найлепш паказаць свой дом, не, не гасцям, а паўнапраўным навасёлам. У пунктах плана падрыхтоўкі імкнуліся прадугледзець як мага больш: запрасіць на свята работнікаў тэлебачання, радыё, рэдакцый газет, заказаць значкі, арганізаваць работу буфета і фотаатэлье «Першы раз у БДУ» і нават пра шары не забыліся... (Толькі вось не прадугледзелі парасонаў ад дажджу, прыйшоўшага на ўрачыстую цырымонію няпрошаным госцем).

Усім арганізатарам свята хацелася, каб яно засталося прыемным успамінам на доўгія гады. Не сакрэт, што ад таго, як удала пачнецца так званы «перыяд асіміляцыі», будзе залежаць, як хутка звыкнуцца з новым распарадкам жыцця мінулыя школьнікі, як упэўнена і трывала яны адчуюць сябе неад'емнай часткай студэнцкага калектыву.

Я ўглядалася ў твары нашых самых маладых таварышаў — і не бачыла ніводнага сумнага, абыякавага ці скептычнага. Наадварот — цікавасць у шырока расчыненых вачах, бо для першакурснікаў усё было ўпершыню: знаёмства з рэктарам, з іншымі кіраўнікамі, будучымі выкладчыкамі, было першым раўненне на чырвоны сцяг БДУ: на сцягі, заваяваныя студэнтамі універсітэта ў вучобе і працы, было першым ускладанне кветак да помніка У. І. Леніну і да мемарыяльнага знака студэнтам і выкладчыкам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

ЯРКІМ МОМАНТАМ свята з'явілася запальванне лепшымі студэнтамі універсітэта Агню Ведаў. У гэтым полымі свяшчэнная памяць пра тых, хто ствараў, будаваў родны універсітэт у грозныя дваццатыя, пра тых, хто з вучэбных аўдыторый ішоў на бітву з ворагам, пра тых, хто не шкадаваў сіл, здароўя, працаваў у навуковых лабараторыях у пасляваенныя гады.

Няхай гэты агонь будзе табе, першакурснік, пуцяводнай зоркай у бязмежным свеце ведаў!

Пачэснае права запаліць Агонь Ведаў прадстаўляецца лепшым студэнтам універсітэта: студэнтцы IV курса ФПМ ленінскай стыпендыятцы Вользе Паўловіч і намесніку сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце аспіранту Аляксандру Каханоўскаму.

Агонь ведаў — гэта добры агонь, калі веды нясуць людзям толькі шчасце. Таму сімвалічна, што Дзень ведаў і Дзень міру адзначаюцца разам. Жаданне міру для ўсіх народаў — гэта не толькі жах перад вайной, смерцю, гэта не толькі эмоцыі — гэта яшчэ вышэйшае праяўленне розуму прагрэсіўнага чалавецтва.

І ўзляцелі, набіраючы вышыню, над дахам універсітэта белыя галубы. Галубы міру...

СВЯТА нарэшце дасягае свайго апагею: наступае момант прысвячэння першакурснікаў у студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Леанід Іванавіч Кісялеўскі ўручае сімвалічны ключ у Краіну ведаў і вялізных памераў студэнцкі білет.





З гэтымі студэнцкімі атрыбутамі трое першакурснікаў пад марш праходзяць уздоўж строю. Адыграў урачысты марш. Загучалі фанфары.

— Мы, прадстаўнікі шматмільённай арміі моладзі, уступаючы ў рады студэнцтва, урачыста клянёмся: свята выконваць запаветы Леніна, упарта і настойліва вучыцца,.. праз усё жыццё несці палаючы факел ведаў,.. — выразна гучаць словы ўрачыстай клятвы студэнта-першакурсніка.

У дружнае трохразовае «КЛЯНЕМСЯ!» верыш, хочацца верыць, што новае папаўненне будзе «высока несці, захоўваць і памнажаць славутыя традыцыі нашы, будзе дастойным пачэснага звання Студэнта і Выпускніка універсітэта, які носіць імя вялікага правадыра рэвалюцыі»! Дадзенаму слову верым!

Агонь ведаў - 1986 перадаецца першакурснікам. Моцна трымай яго, таварыш! Не падвядзі!

А ПОТЫМ быў канцэрт мастацкай самадзейнасці творчых сіл універсітэта. За некалькі хвілін зала аказалася біткома набітай. Адбылася першая сустрэча з нашым мастацтвам. І трэба адзначыць, што яна прайшла на лепшым узроўні! Хаця не абышлося тут без маленькіх хітрыкаў: канцэрт гэты меў на ўвазе не толькі пазнаёміць першакурснікаў з нашымі калектывамі, не толькі пазабавіць, ён — своеасаблівая агітацыя: «Прыходзьце да нас! І вы будзеце таксама спяваць і танцаваць, таксама шчыра дарыць радасць людзям!» І дарэчы заўважыць, адразу пасля канцэрта і ў наступныя дні жадаючых запісацца ў мастацкія калектывы знайшлося нямала.

Увечары для маладых ног новых студэнтаў грала дыскатэка...

Рэпартаж правяла
А. ВІХРОВА,
наш кар.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

З НАШАЙ ПОШТЫ

# Маршрутамі подзвігу

**Штогод арганізацыя студэнтаў з ГДР, якія вучацца ў Мінску, праводзіць паходы, прысвечаныя памяці Героя Савецкага Саюза Фрыца Шменкеля, Аб апошнім паходзе, прысвечаным 70-годдзю адважнага партызана-антыфашыста, хацелася б расказаць больш падрабязна.**

У МІНСК па запрашэнню гаркома партыі прыбыла жонка героя Эрна Шменкель, а таксама турысцкая група з ГДР, у якую ўваходзілі прадстаўнікі больш як дваццаці працоўных калектываў, што носяць яго імя. Разам з імі мы адправіліся ў паход па месцах баёў партызанскага атрада «Смерць фашызму», у якім змагаўся і наш суайчыннік Фрыц Шменкель.

Прыбыўшы ў Смаленск, мы сталі ўдзельнікамі ўрачыстага мітынгу, зрабілі экскурсію па гораду, а потым адправіліся ў невялікую вёску, дзе знаходзіцца створаны мясцовымі краязнаўцамі музей баявой славы. Міхаіл Аляксандравіч Пярсідскі, былы партызан, таварыш Ф. Шменкеля, быў нашым гідам. Ён расказаў аб партызанскім руху ў краі, паказаў сабраныя ў музеі матэрыялы аб жыцці і барацьбе Фрыца Шменкеля.

А потым мы зноў вярнуліся ў Смаленск. Тут, у абкоме камсамола, адбыўся сход, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі Смаленскага педінстытута імя Карла Маркса, МАЗа і нашай пярвічнай арганізацыі ССНМ. Гера Шарфэ, студэнт 5-га курса БПІ, па даручэнню пасольства ГДР у Савецкім Саюзе ўзнагародзіў двух былых партызан — Фёдара Іванавіча Русакова і Аляксандра Піліпавіча Чачанкова — залатым пачэсным знакам Таварыства германа-савецкай дружбы.

Крысціна ШУБЕЛЬ,
студэнтка філалагічнага
факультэта.

# На павестцы — перабудова

СЕННЯ працэс абнаўлення ідзе ва ўсіх сферах нашага грамадства. І работа па перабудове вышэйшай школы стала яго неад'емнай часткай.

Як адзначалася на XXVII з'ездзе КПСС, у апошні час «рост выпуску спецыялістаў не суправаджаўся адначасова з ім належным павышэннем якасці іх падрыхтоўкі. Узровень навучання і выхавання не ў поўнай меры адказвае задачам паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны». З'езд высветліў прычыны гэтых і іншых застойных з'яў, указаў шляхі іх паскоранай ліквідацыі.

Адзначаныя на з'ездзе недахопы ў дзейнасці вышэйшай школы можна ў многім убачыць і на прыкладзе нашага калектыву.

Як хутчэй пазбавіцца ад іх?

Прамы шлях да паляпшэння становішча ўказваецца ў Праекце ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне»: «Важнейшы напрамак і асноўны рычаг перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — яе трывалая інтэграцыя з вытворчасцю і навукай, пераход да новых прынцыпаў іх узаемадзеяння».

Сувязь універсітэта з практыкай мае свае асаблівасці, бо мы рыхтуем спецыялістаў не толькі для вытворчых сфер, але і для сістэмы адукацыі, журналістыкі, юрыспрудэнцыі. Таму асноўным звяном умацавання сувязі вучэбнага працэсу з жыццём павінны стаць факультэты і кафедры.

Універсітэт цяпер рыхтуе спецыялістаў па 18 спецыяльнасцях і 80 спецыялізацыях. Структуру спецыяльнасцей, відаць, можна лічыць аптымальнай, яна адпавядае профілю нашых 11 факультэтаў і ўлічвае тую акалічнасць, што шэраг факультэтаў мае вытворчае і педагагічнае аддзяленні. Што ж датычыцца спецыялізацый, то нам уяўляецца, што некаторыя прафілюючыя кафедры не ў поўнай ступені могуць ажыццяўляць свае функцыі, хаця б па прычыне сваей малакалькаснасці.

Важным элементам інтэграцыі з'яўляецца мэтавая падрыхтоўка кадраў. У наступных пяцігодках нам належыць пашырыць гэтую форму падрыхтоўкі спецыялістаў. Ад 15-20 працэнтаў, якіх мы дасягнулі на сучасны момант, неабходна перайсці па меншай меры да 60 працэнтаў. Пры гэтым мэтавая падрыхтоўка павінна набыць дакладныя арганізацыйныя, прававыя і эканамічныя формы.

Ацэньваючы сітуацыю ў цэлым, трэба прызнаць, што рэзультатыўнасць вучэбнага працэсу ва універсітэце яшчэ далёка не адпавядае новым патрабаванням. Таму як і раней перад універсітэтам стаяць сур'ёзныя задачы па ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу, хаця ў гэтым напрамку зроблена і нямала. Ва універсітэце прыняты меры па павышэнню светапогляднай накіраванасці вучэбнага працэсу, выключэнню з праграм другаступеннага матэрыялу. Павышана роля фундаментальных навук, ідэйна-тэарэтычны і метадычны ўзровень лекцый. Ажыццяўляецца пошук шляхоў інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу на аснове комплекснага выкарыстання перадавых метадаў, арганізацыйных форм і сродкаў навучання. Нямала зроблена і па развіццю ў студэнтаў актыўнага творчага мыслення, павышэнню навуковай змястоўнасці і практычнай значнасці курсавых і дыпломных работ.

Пастаноўка навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу на факультэтах і кафедрах сістэматычна вывучаецца і аналізуецца рэктаратам. Гэта праблема была прадметам зацікаўленага абмеркавання на пасяджэнні рэктарата ў лістападзе 1985 года і савета універсітэта ў сакавіку 1986 года. Двойчы ў семестр збіраўся метадычны семінар дэканаў, загадчыкаў кафедраў, кіраўнікоў аддзелаў і служб па вывучэнню дакументаў партыі і урада аб вышэйшай школе, вопыту арганізацыі і кіравання вучэбна-выхаваўчым працэсам ва універсітэце і іншых ВНУ краіны. На ўсіх факультэтах і большасці кафедраў створаны і актыўна працуюць навукова-метадычныя семінары. На працягу вучэбнага года ва універсітэце выдадзена і ўкаранёна ў вучэбны працэс каля 260 метадычных распрацовак.

У апошнія гады на занятках усё часцей стала выкарыстоўвацца методыка сітуацыйных і дзелавых гульняў (юрыдычны факультэт, кафедра псіхалогіі). Заслугоўвае ўвагі і вопыт правядзення заняткаў у форме абароны рэфератаў, дзе самі студэнты выступаюць у ролі апанентаў. На кафедрах замежных моў паспяхова выкарыстоўваюцца праблемныя сітуацыі і прыёмы інтэнсіўнай методыкі.

ПРАЕКТ ЦК КПСС адлюстраваў неабходнасць удасканалення арганізацыі самастойнай працы студэнтаў. Зрухі ў гэтым напрамку ўжо ёсць. На многіх факультэтах вызначаны спецыяльныя аўдыторыі і лабараторыі для самастойнай працы студэнтаў, з імі праводзяцца індывідуальныя кансультацыі, шырока выкарыстоўваюцца аўтаматызаваныя сродкі кантролю.

Аднак многія нашы добрыя пачынанні не атрымалі яшчэ шырокага распаўсюджвання. Не на адпаведным узроўні пастаўлены і кантроль за паспяховасцю студэнтаў на працягу ўсяго вучэбнага года. Не ўсе выкладчыкі ажыццяўляюць кантроль вучэбнай работы студэнтаў у працэсе саміх заняткаў. Не арганізавана і сістэматычная праверка дамашніх заданняў.

Ва універсітэце ўжо шэраг гадоў на факультэтах існуюць экраны паспяховасці. Аднак не ўсюды яны вядуцца належным чынам.

Ключавым пытаннем усёй нашай працы з'яўляюцца педагагічнае майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу, якасць лекцый і практычных заняткаў. Мы можам адзначыць пэўныя дасягненні. Праведзена сур'ёзная работа па абнаўленню лекцыйных курсаў на аснове дасягненняў сучаснай навукі і передавога вопыту вытворчасці. Асабліва многа было зроблена на кафедрах грамадскіх навук пасля XXVII з'езда КПСС. Прыклад паказваюць нашы вопытныя прафесары: А. А. Галаўко (юрыдычны факультэт) — 172 гадзіны лекцый у мінулым вучэбным годзе, Д. Б. Мельцар (гістарычны факультэт) — 178 гадзін, дацэнт Н. І. Жураўская (геаграфічны факультэт) — 182 гадзіны і іншыя.

У той жа час многія дацэнты і старшыя выкладчыкі не турбуюць сябе чытаннем лекцый, ды і агульная іх вучэбная нагрузка, прама скажам, не вялікая.

У ходзе перабудовы вышэйшай школы нам належыць абнавіць змест адукацыі на аснове перадавых дасягненняў навукі, тэхнікі, культуры і вытворчасці, мадэрнізаваць структуру навучання і метады выкладання. Дамагчыся, каб спецыялісты авалодалі самымі сучаснымі ведамі, звычкамі высокапрадукцыйнай эфектыўнай працы, пастаянна папаўнялі свой тэарэтычны і прафесійны багаж.

І гэтую работу трэба пачынаць з крытычнага аналізу нашых памылак і пралікаў. Трэба прызнаць, што існуючая сістэма выкладання яшчэ ў многім мае такія заганы, як фармалізм, разлік на рэцэптурнае навучанне, многія выкладчыкі страцілі густ да педагагічнай творчасці.

Мы цяпер вучым залішне многаму, а трэба вызначыць галоўнае, акрэсліць фундаментальныя веды і забяспечыць не толькі іх засваенне, але і трывалае замацаванне, давесці да навыкаў. Курс павінен быць узяты на актыўныя формы і метады навучання, на рашучы пераход ад школы памяці да школы мыслення — школы творчасці, школы высокага прафесіяналізму. З гэтай мэтай неабходна пераглядзець аб'ём лекцыйных заняткаў, карэнным чынам перабудаваць семінары, рэзка ўмацаваць ролю лабараторных практыкумаў, забяспечыць шырокае выкарыстанне дзелавых гульняў, развіць комплекснае курсавое і дыпломнае праектаванне. Цэнтр цяжару ў вучэбным працэссе павінен быць перанесены на арганізацыю самастойнай працы студэнтаў. Такім чынам будуць стымулявацца свядомыя адносіны будучых спецыялістаў да авалодвання ведамі. Гэта вялікае поле дзейнасці для ўсіх факультэтаў і кафедраў.

ВАЖНЫМ бокам дзейнасці універсітэта з'яўляюцца навуковыя даследаванні, значнасць якіх і аб'ём павялічваюцца з году ў год.

У 1985 годзе універсітэт удзельнічаў у выкананні заданняў 74 саюзных, рэспубліканскіх, міжнародных і галіновых праграм па 197 тэмах НДР (42,1%). Па шэрагу буйных раздзелаў і заданняў праграм універсітэт з'яўляецца галаўной арганізацыяй.

У 1985 годзе ўкаранёна ў народную гаспадарку 212 навукова-даследчых работ (у 1984 — 141). Эканамічны эфект ад укаранення НДР склаў у 1985 годзе 23,5 млн. рублёў (1984 — 21,7 млн. рублёў). Атрымана станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў 242 (246), укаранёна вынаходніцтваў — 165 (89), выдадзена работ (манаграфій, зборнікаў, навуковых прац, вучэбных дапаможнікаў і інш.) — 325 (294), надрукавана артыкулаў 3786 (3447). На міжнародныя, усесаюзныя і рэспубліканскія выстаўкі прадстаўлена 78 экспанатаў. Нашы дасягненні адзначаны 31 дыпломам ВДНГ БССР, 20 медалямі ВДНГ СССР. 26 распрацовак прапанаваны для шырокага ўкаранення на прадпрыемствах краіны.

У арганізацыі навуковых даследаванняў па-ранейшаму важнейшай задачай з'яўляецца канцэнтрацыя сіл і сродкаў на важнейшых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу, атрыманне большага эфекту ад укаранення НДР у вытворчасць і вучэбны працэс, павышэнне ліку НДР, прымаемых да серыйнай вытворчасці.

Важную ролю іграе НДР студэнтаў у павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, фундаменталізацыі універсітэцкай адукацыі.

Усімі формамі НДР у цяперашні час ахоплена 5450 студэнтаў дзённай формы навучання, 715 студэнтаў удзельнічаюць у выкананні гаспадарча-дагаворных работ.

Аднак, было б памылковым самазаспакойвацца і задавальняцца дасягнутым. Многае ў арганізацыі НДР і ВДР студэнтаў патрабуе карэннага паляпшэння. Планаванне НДРС вядзецца ў шэрагу выпадкаў фармальна, недастатковая яе забяспечанасць неабходнымі матэрыяламі і апаратурай. Прыцягненне студэнтаў да навуковай работы на некаторых кафедрах вядзецца бессістэмна. Ёсць выпадкі, калі навукова-метадычная работа па фарміраванню ў студэнтаў творчых навыкаў падмянялася дробязнай апекай, а ў некаторых выпадках выкананнем супрацоўнікамі кафедры асноўнай часткі даследаванняў за студэнтаў.

РАШЭННЕ універсітэтам першачарговых задач, якія вынікаюць з патрабаванняў партыі і ўрада, немагчыма без творчай актыўнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу, яго навуковай і метадычнай кваліфікацыі. Вось чаму нам неабходна надаваць самую вялікую ўвагу паляпшэнню якаснага саставу навуковых і кавукова-педагагічных кадраў.

Пытанні паляпшэння якаснага саставу навуковых і навукова-педагагічных кадраў павінны і ў будучым пастаянна заставацца ў полі зроку.

У гэтай сувязі важнае значэнне набывае і становішча мікраклімату ў нашых падраздзяленнях. Неабходна пастаянна нацэльваць выкладчыкаў і супрацоўнікаў на больш высокую арганізаванасць, дысцыплінаванасць, добрасумленнасць у выкананні сваіх канкрэтных абавязкаў. Зрухі да лепшага намеціліся ў калектывах механіка-матэматычнага, фізічнага, юрыдычнага, факультэта радыёфізікі і электронікі, НДІ ПФП і іншых службаў і падраздзяленняў. Тут партыйныя арганізацыі і адміністрацыя арганізуюць людзей і накіроўваюць іх энергію на высокапрадукцыйную працу, умела рашаюць узнікаючыя канфлікты. Але такое становішча не ўсюды.

У бягучым годзе студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта зроблена 27 правапарушэнняў. У параўнанні з мінулым годам гэты паказчык знізіўся прыкладна на 35 працэнтаў.

Аднак хочацца звярнуць увагу на адну сур'ёзную асаблівасць. У мінулыя гады асноўная частка правапарушэнняў належала студэнтам. У выніку вялікай прафілактычнай работы правапарушэнні з боку студэнтаў значна паменшыліся. А вось з боку супрацоўнікаў такія выпадкі не зніклі. З 27 правапарушэнняў студэнтамі зроблена 10, астатнія здзейснены супрацоўнікамі. Сярод парушальнікаў — старшыя навуковыя супрацоўнікі Храпавіцкі (фізфак), Богдзель (геафак), выкладчык Афанасьеў (падрыхтоўчы факультэт), галоўны энергетык Смірноў, старшы інжынер ВЦ Пальцаў, старшы тэхнік кафедры радыяцыйнай хіміі Ласкутоў, лабарант кафедры фізвыхавання Нікалаеў. Усе яны былі затрыманы органамі міліцыі за паяўленне ў грамадскіх месцах у нецвярозым стане. Ласкутоў і Смірноў былі накіраваны ў медвыцвярэзнік.

З такімі з'явамі калектыў універсітэта не можа болей мірыцца. Мы павінны павесці самую рашучую барацьбу з праяўленнямі недысцыплінаванасці, нядбайных адносін да сваіх службовых абавязкаў, амаральных учынкаў.

ПАРТЫЯ паставіла перад вышэйшай школай стратэгічную задачу: павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

У гэтай сувязі нам неабходна будзе палепшыць вучэбна-выхаваўчы працэс, перагледзець наменклатуру спецыялізацый, унесці неабходныя змены ў кваліфікацыйныя характарыстыкі, уважліва прааналізаваць патрэбнасць у кадрах па асобных спецыяльнасцях і прыняць меры па павышэнню іх узроўню кваліфікацыі.

Неабходна значна павысіць узровень выкладання марксізма-ленінізма. Сумесна з выкладчыкамі іншых дысцыплін грамадазнаўцы павінны прывіваць будучым спецыялістам навыкі творчага прымянення дыялектыка-матэрыялістычнага метаду ў іх прафесійнай і грамадскай дзейнасці.

На адно з першых месц ў справе практычнага ажыццяўлення курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны партыя ставіць перабудову псіхалогіі кадраў, зварот іх да новых задач, усямернае развіццё творчасці і ініцыятывы. Атмасфера наватарства, нецярпімасці да коснасці і руціны павінна паўсюдна замацавацца ў нашым універсітэцкім калектыве з першых дзён новага вучэбнага года.

Чэрвеньскі Пленум ЦК КПСС арыентуе на рашучыя дзеянні, на пошук і мабілізацыю ўнутранных рэзерваў, на хутчэйшыя дасягненні важкіх вынікаў ва ўсёй нашай дзейнасці.

Агульныя ідэі перабудовы вышэйшай школы ўжо выразны, а што датычыцца дэталей нашай работы, то тут мы павінны дзейнічаць без дробязных падказак. Каб надаць перабудове сапраўдны размах, кожны з нас павінен успрыняць яе як уласную, кроўную справу жыцця. Прамы абавязак рэктарата, парткома, грамадскіх арганізацый, усяго калектыву універсітэта — дамагчыся стварэння ва універсітэце абставін прынцыповасці, высокай узаемнай патрабавальнасці і таварыскай узаемадапамогі, нецярпімасці да парушэнняў законнасці і маралі.

Цяперашні этап развіцця грамадства патрабуе ад кожнага калектыву БДУ новых намаганняў, прынцыповасці ў ацэнцы уласнай дзейнасці. Трэба больш востра ставіць пытанне развіцця крытыкі і самакрытыкі, трэба, каб кожны член нашага калектыву дзейнічаў адказна і ініцыятыўна, каб у калектыве панавалі абставіны ўзаемнай павагі і патрабавальнасці, адзінства слова і справы.

Рэзка павінна павысіцца калектыўная і індывідуальная адказнасць за якасць і канчатковыя вынікі вучэбнага, выхаваўчага і даследчага працэсу.

Гэта патрабуе адмаўлення ад апісальніцтва ў навучанні, увядзення міждысцыплінарных, інтэграваных курсаў, пераходу ад маналагічнага выкладання вучэбнага матэрыялу да дыялогу выкладчыка са студэнтамі, умацавання праблемнага навучання.

Галоўным у дзейнасці калектыву універсітэта павінен стаць шлях пастаяннага абнаўлення зместу усёй вучэбна-выхаваўчай работы, усіх яе форм і метадаў з тым, каб забяспечыць пастаянную адпаведнасць сістэмы вышэйшай адукацыі бягучым і перспектыўным задачам паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Вучэбны працэс павінен быць гібкім, прыладкоўвацца да таго новага, якое штодзённа ўваходзіць у практыку. Для гэтага неабходна пастаянная, насычаная праца выкладчыкаў у галіне сваёй навукі. Самыя сучасныя вучэбныя планы і праграмы не дапамогуць, калі выкладчыкі не стануць сапраўднымі майстрамі сваёй справы, настаўнікамі моладзі.

Мы змаглі некалькі скараціць дробнатэмнасць, засяродзіць намаганні вучоных на распрацоўцы важнейшай тэматыкі, і ўсё ж недахопаў і упушчэнняў у нас яшчэ шмат. Неабходна, каб кожная кафедра дэталёва прааналізавала даследчую дзейнасць кожнага выкладчыка, вызначыла яе адпаведнасць патрабаванням часу, склала дакладныя планы прадстаўлення вынікаў даследаванняў для надрукавання ці ўкаранення ў вытворчасць.

У сувязі з новымі патрабаваннямі да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў неабходна ўзняць на новую якасную прыступку і навукова-даследчую работу студэнтаў. Неабходна прыняць энергічныя меры па укараненню даследаванняў ва ўсе віды вучэбных заняткаў.

Патрабуе паляпшэння арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Яна павінна стаць прадметам сур'ёзнага абмеркавання на розных узроўнях. Трэба звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на вывучэнне бюджэту вольнага часу студэнтаў, бо ад яго правільнай арганізацыі ў многім залежыць эфектыўнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу. Неабходна больш абагульняць і прапагандаваць лепшы вопыт работы выдатнікаў вучобы.

Асноўны змест перабудовы вышэйшай школы складае трывалая інтэграцыя адукацыі, вытворчасці і навукі, пераход да новых прынцыпаў іх узаемадзеяння. Задача калектыву універсітэта ў тым, каб усямерна паглыбляць і пашыраць вучэбна-выхаваўчы працэс, развіццё навукі, узняць узровень практычнай падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў.

Л. КІСЯЛЕЎСКІ,
рэктар Белдзяржуніверсітэта
імя У. І. Леніна,
акадэмік АН БССР.

**УВАГА: ЭКСПЕРЫМЕНТ**

# «ЧАРАЎНІЦЫ»

Згадзіцеся, мілагучнае і загадкавае, нават казачнае імя. Пачуўшы яго, кожны пацікавіцца: аб чым гаворка? А пойдзе яна пра адзін са студэнцкіх атрадаў, што быў створаны мінулым летам на факультэце прыкладной матэматыкі. Адкуль такая назва? Доўга спрачаліся байцы атрада, перш чым адшукалі слова, што адразу б перадало сутнасць той справы, якой яны будуць займацца ў працоўным семестры. Тады ж нехта прапанаваў:

— А што, калі назавёмся мы «Чараўніцамі»?

І ўсе згадзіліся.

МНЕ ЗДАЕЦЦА, зусім не выпадковым быў выбар. І не толькі таму, што працавалі ў атрадзе дзяўчаты прыгожыя, ветлівыя, шчодрыя на ўсмешку. Хутчэй за ўсе разгадка назвы крыецца ў тым, які сэнс укладвалі байцы атрада ў слова «праца», лічачы, што гэта заўсёды хоць невялічкае, але сапраўднае, створанае ўласнымі рукамі чараўніцтва. Вядома ж, праца прыносіць людзям радасць і дапамагае адкрываць для сябе нешта новае ў адносінах да дручанай справы, да сяброў, што працуюць побач.

Многія лічылі, што васемнаццаці дзяўчатам з атрада «Чараўніцы» проста не пашанцавала. Атрад нельга аднесці да разраду «прэстыжных». Мяркуйце самі: ні аб якім выездзе за межы рэспублікі нават і гаворкі не вялося — атрад заставаўся працаваць у Мінску. Ды і аб'екты ім дасталіся хоць і не звычайныя для байцоў будаўнічых атрадаў, але самыя што ні на ёсць празаічныя — студэнцкія інтэрнаты, у якіх рабіўся рамонт жылых памяшканняў. Праца ў атрадзе не абяцала ні рамантыкі блакітных далячынь, ні вялікіх заробкаў. І ўсё ж, калі камсорг Наташа Захарэнкава даведалася аб задумцы штаба працоўных спраў камітэта камсамола універсітэта стварыць упершыню ўнутрывузаўскі студэнцкі атрад, прапанавала камсамольцам групы стаць яго байцамі. Яе падтрымалі.

Так і адбылося — працаваць разам згадзіліся амаль усе, камандзірам выбралі Наташу. З гэтай нагоды — студэнцкая група стала першым унутрывузаўскім будаўнічым атрадам — аб «Чараўніцах» загаварылі як аб атрадзе эксперыментальным. Самі ж дзяўчаты тлумачаць усё проста:

— Нам не хацелася расставацца на ўсё лета. Быць першаадкрывальнікамі, удзельнікамі новай справы таксама цікава. Да таго ж, будатрад высветліў тое добрае ў нашых адносінах, што склалася ў час вучобы, і дазволіў убачыць недахопы.

Што больш за ўсё падабаецца людзям у іх дамах? Зразумела, надзейнасць, камфорт і прыгажосць. Адзначу, апошняе ў вялікай ступені неабходна для таго, каб дом лічыўся ўтульным і цёплым. А гэта ўжо залежыць ад майстэрства і жадання тых, хто яго будаваў.

Аб майстэрстве. Байцам атрада яго першы тыдзень вельмі не хапала. Таму і глядзелі на іх недаверліва вопытныя маляры. Не хацелі даручаць адказную справу. Дзяўчат гэта некалькі крыўдзіла, але разумелі, што практычных навыкаў у іх сапраўды малавата. Гэта ж толькі на першы погляд здаецца: раз-два — і фарба роўным слоем сама кладзецца на сцяну, тры-чатыры — і на столі не застаецца ніводнай плямы. Потым нечакана для сябе заўважаешь, як не слухае тваёй рукі пэндзаль, дазнаешся пра тое, што, каб зрабіць сцяну роўнай, трэба доўга працаваць, шпаклюючы яе. І яшчэ шмат падобных сакрэтаў, аб якіх раней, у падрыхтоўчы перыяд, дзяўчаты маглі толькі здагадвацца.

Чаму так атрымалася? Чаму няёмка зараз байцам успамінаць пра першыя дні? Спрабавала разабрацца ў гэтым камандзір Наташа, прыходзіла на дапамогу ёй камісар Таня Яшчына... Здарылася так, што стварыўся атрад у апошнія дні перад працоўным семестрам і прафесійную падрыхтоўку яго байцы праходзілі ўжо ў час сесіі, калі ні студэнты, ні майстар з ПТВ-25 не мелі часу. І тэарэтычныя веды, на жаль, не паспелі падмацавацца практыкай.

Аб жаданні. Спачатку яны разлічвалі, што будуць рамантаваць толькі інтэрнат № 7. Зразумела, настройваліся сур'ёзна, інакш нельга, калі рамантуеш свой дом. А потым даведаліся, што іх рукі больш патрэбны для выканання работ у інтэрнаце № 2. Думаеце, склалі пэндзалі, адмовіліся працаваць? Ці наогул забыліся пра былыя імкненні? Кожны разумеў: жыхары свайго інтэрната (а сярод іх нямалая колькасць байцоў атрада і іх сяброў) могуць дараваць няўдалую спробу, іншыя ж браку не будуць трываць.

Жаданне — паказчык таго, як узрастала з кожным днём іх умельства. Калі ўдавалася зрабіць тую ці іншую работу на «выдатна», хацелася працаваць яшчэ больш, лепш. Чым іншым, як не імкненнем надаць студэнцкаму дому ўтульнасць і прыгажосць тлумачыцца «бітва» Наташы за святлейшы колер фарбаў? Пра многае аб іх працы можна даведацца, пачуўшы адну толькі фразу Аксаны Царыкавай.

— Мы не пэцкаем — мы фарбуем. Праца ў нас творчая.

І гэта не толькі словы. Вось Рыта Нікіфарава магла сабе ціхенька фарбаваць так, як у першыя дні яе вучылі, нічога не выдумваючы, але не пажадала: знайшла спосаб, які ў атрадзе празвалі «квадрацікі». Аказваецца, так лягчэй і хутчэй атрымліваецца.

Адкрыццяў у іх было шмат. І самыя галоўныя:

— Мы зразумелі, што можам працаваць самастойна, і пераканаліся ў тым, што студэнцкі атрад, які працуе на рамонце інтэрнатаў — справа патрэбная ў першую чаргу нам самім, — адзначыла Аня Луханіна.

— Нядрэнна было б, каб кожны студэнт адчуў сябе ў інтэрнаце гаспадаром. Вядома ж, сапраўдны гаспадар не той, хто прыходзіць на ўсё прыгатаванае. Ён павінен працаваць сам дзеля стварэння ўласнага дома,— дадала Таня Спірыдонава.

— Іменна на гэта звярталі ўвагу і мы, ствараючы атрад «Чараўніцы», — гаворыць Ігар Вярэнчыкаў, начальнік штаба працоўных спраў камітэта камсамола універсітэта.— Аб тым, што эксперымент атрымаўся, зараз можна ўжо гаварыць з упэўненасцю. Былі і памылкі. І першая з іх — адсутнасць у атрадзе хлопцаў, якія б выконвалі ўласна мужчынскія аперацыі: разводзілі фарбы, шпаклявалі... Але без недахопаў рэдка якая новая справа абыходзіцца.

— І эксперымент у наступным годзе ўжо стане справай звычайнай?

— Абавязкова! Няма неабходнасці ствараць такія атрады на кожным факультэце. Дастаткова, каб яны працавалі ў кожным інтэрнаце. Потым будзе магчымасць весці гаворку аб круглагодовым атрадзе, які будзе выконваць работы па рамонту.

Атрад «Чараўніцы» стаў яшчэ адным крокам да студэнцкага самакіравання. А пакуль што аб працы яго байцоў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Тарасевіч гаворыць лаканічна:

— Добра працавалі дзяўчаты. Мы — за такія атрады.

М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.



## Гітары гук усё запаланіў...

*СКОНЧЫЛІСЯ чароўныя летнія дні, будатрадаўская куртка мірна адпачывае ў шафе, жыхары вёсак і пасёлкаў доўга яшчэ будуць успамінаць бадзёрыя дзявочыя галасы і акрылены малады смех.*

*Аб чым ты думаеш, дзяўчына?*

*Куды звернуты твой дапытлівы позірк?*

*Недзе там далёка засталіся пабудаваныя фермы, дамы, пляцоўкі, водар смаляных стружак і палявых кветак. Неаднойчы ўспомніцца і поле, на якім захапіў дождж, і калгасны сад. І сярод усяго гэтага — шчырасць, задушэўнасць, голас гітары...*

*С. РАМАНАВА.*
*Фотаэцюд С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

**Рэха трэцяга семестра**

*Вось яшчэ пра адно студэнцкае лета прыходзіцца гаварыць у мінулым часе — было. Для вялікай студэнцкай сям'і універсітэта яно прынесла шмат прыемнага, карыснага, новага, цікавага. На жаль, не абышлося без праблемнага, канфліктнага...*

**ПЫТАННЕ РУБАМ**

# Ці выпадковасць?

— Дзеці, скажыце: сыр,— просіць фатограф. Гэта маленькая хітрасць патрэбна яму для таго, каб не былі «кіслымі» твары на фотаздымку.

— Цырк,— не гучна, але выразна кажуць рабяты, бо яны, як усе дзеці, любяць рабіць усё па-свойму.

Я КОЖНЫ раз успамінаю гэты момант, калі трымаю ў руках здымкі маіх дзяцей — піянераў шостага атрада піянерскага лагера «Арляня», што ў Краснадарскім краі. Чаму мае дзеці? Бо я была іх важатай. Выпадкова...

Неяк ад сяброўкі (яна член факультэцкага камітэта камсамола) пачула, што ва універсітэце фарміруецца атрад важатых і выхавацеляў для працы ў піянерскім лагеры «Арляня». Прывабіла, безумоўна, месца знаходжання лагера — Чарнаморскае ўзбярэжжа Каўказа. Уяўляеце: горы, мора, шмат сонца. І ўсё гэта разам і ў неабмежаванай колькасці. Ужо цяпер, праз пэўны час, зноў і зноў вяртаюся да думкі, што іменна гэта — мора, горы, сонца — стала прычынай такой папулярнасці Геленджыкскага педатрада. І іменна гэта было той суб'ектыўнай прычынай пытальных знакаў, якія ўзнікалі значна пазней, калі атрад ужо выехаў у лагер.

Як і я, многія пра атрад даведаліся выпадкова. І нельга рэзка адхіляць думку аб тым, што яны таксама выпадкова трапілі ў атрад. Адбор людзей для такой адказнай работы, работы з дзецьмі, патрабуе асабліва пільнага падыходу да пытання камплектавання педагагічных атрадаў.

Мне праходзіць піянерскай практыкі не было патрэбы. Але было іншае — жаданне паспрабаваць сябе ў гэтай справе. Здавалася — я вярнулася ў дзяцінства. Успамінала, як сама ў школе ездзіла ў піянерскія лагеры, як мне шанцавала на важатых. Многа перадумала да выезду: а ці змагу? Як падступіцца да дзяцей? У чым заключаюцца асаблівасці працы важатых сёлета? Шкада, што неяк бокам, незаўважанымі прайшлі гэтыя пытанні для тых, хто займаўся фарміраваннем атрада.

У атрад былі ўключаны студэнты розных факультэтаў: мехмата, філфака, юрыдычнага. Зразумела, што пэўная частка іх ніякага дачынення да педагагічнай работы не мела і мець не будзе. А калі ўлічыць, што будучыя настаўнікі, члены атрада, закончылі I-II курсы і ехалі ў лагер упершыню, то зусім незразумелым становіцца той факт, што ніякай вучобы з будучымі важатымі і выхавацелямі не было праведзена.

Скажаце, выпадкова так здарылася, не паспелі. А нехта аб'ектыўную прычыну адшукае — позна, толькі ў сярэдзіне мая пачалося фарміраванне атрада. Склалася ўражанне, што вырашалі адну праблему: сабраць атрад. Пра другую — яго ж да работы падрыхтаваць яшчэ трэба — выпадкова забыліся, абставіны, маўляў, так сышліся.

Некаторыя лічылі, што і на месцы ў нас не зусім добра абставіны сышліся. Уяўляеце: думалі працаваць важатым лягчэй лёгкага, а выйшла... Вось тут наша непадрыхтаванасць незамарудзіла наверх выйсці. Я зайздросціла сама сабе. Вопыт піянерскай работы яшчэ са школы, надзейная Ірына Васільеўна (выхавацель атрада), вопыт работы з цяжкімі падлеткамі. Гэта так дапамагло!

У некаторых жа ніякага асабістага вопыту піянерскай работы не было. Правільна, можна на хаду навучыцца. А калі не было жадання? На жаль, так засталося адкрытым гэта пытанне пра важатых і нежаданне працаваць...

Мне спадабалася быць важатай. Спадабалася гуляць з дзецьмі, прыдумваць зборы, конкурсы... Пры магчымасці не адмоўлюся яшчэ раз папрацаваць у піянерскім лагеры. Не спадабаліся мне толькі вось усе тыя «выпадковыя» моманты. Хіба так ва ўсіх педатрадах?

Дарэчы, дарагі чытач, я не паведаміла галоўную «выпадковасць»: у нас жа і не было ніякага атрада — проста група студэнтаў прыехала, хто працаваць і адпачываць, а хто наадварот — адпачываць і працаваць. Мы так і не з'ядналіся за дзве змены. Мы так ні разу ўсе да адзінага не сабраліся, нават не праспявалі разам ніводнай песні. Можа, выпадкова не хапіла часу, жадання?..

Я — абедзвюма рукамі за педатрады: у нашай рэспубліцы ці за яе межамі. Я — за мора, горы, сонца. Але, у першую чаргу, я — за добрасумленнасць усіх пры фарміраванні, падрыхтоўцы, рабоце такіх атрадаў. І іменна атрадаў, а не разрозненых груп — групак студэнтаў.

А выпадковасць? Яе лепш у бок адкінуць, бо гэта палачка-выручалачка для тых, хто павінен адказваць за справу, але забываецца на гэта. Ці не так?

С. ГОГАЛЬ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
9 кастрычніка 1986 г.
АТ 08046. Зак. 1242.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.